УДК 811. 161. 3 – 08

А.В. РАДНЯНКОВА

СТЫЛІСТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЧУЖОГА МАЎЛЕННЯ Ў ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫХ ТЭКСТАХ (КАНЕЦ XIX – ПАЧАТАК XX СТ.)

У артыкуле на матэрыяле публіцыстычных тэкстаў к. XIX – п. XX ст. усебакова аналізуюцца стылістычныя асаблівасці чужога маўлення. Падрабязна апісваюцца розныя спосабы перадачы чужой мовы: тэматычнае маўленне, ускосная мова (злучнікавая і бяззлучнікавая), простая мова, якая выкарыстоўваецца аўтарамі не толькі як сродак характарыстыкі персанажаў, але і для падмацавання думак, аргументаў, якія прыводзяцца ў публіцыстычным тэксце. Аўтар таксама размяркоўвае дзеясловы, якія ўводзяць ускосную мову, па семантычных групах. Даследаванне фактычнага матэрыялу дазваляе зрабіць слушны вывад аб тым, што прычыны выкарыстання выказванняў іншых асоб у публіцыстычных тэкстах к. XIX – п. XX ст. вынікаюць з самой прыроды стылю, імкнення, з аднаго боку, да ўсебаковага паказу падзей, шматаспектнасці,

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

дакладнасці інфармацыі, з другога боку, да эмацыянальнага выражэння думкі з максімальнай эфектыўнасцю як для чытача, так і для самога аўтара.

Публіцыстычны тэкст адлюстроўвае розныя бакі чалавечага жыцця. Выкарыстоўваючы элемент размоўнасці пры перадачы звычайнай інфармацыі, аўтар тым самым выклікае ў свядомасці чытача сапраўдны эмацыянальны водгук на прачытанае. Выказванні іншых асоб, якія часам уключаюцца ў аўтарскае паведамленне, лічацца чужой мовай і надаюць размоўны характар тэксту, заахвочваюць чытача пры чытанні.

Пытанні аб выкарыстанні чужой мовы, яе функцыянаванні ў мастацкай літаратуры або паэзіі, тэарэтычныя аспекты размежавання простай, ускоснай і няўласна-простай мовы, адметнасці яе ў пісьмовай і вуснай камунікацыі вызначалі ў сваіх працах наступныя даследчыкі: Л.І. Бурак, М.Я. Цікоцкі, А.Г. Міхалевіч, М.К. Мілых, Р.М. Чумакоў, Е.М. Сак. А.І. Фефілаў жа скіроўвае сваю працу, напрыклад, на вывучэнне мадальна-прагматычнай інтэрпрэтацыі чужога выказвання. Мэтай нашага даследавання з'яўляецца выяўленне і аналіз розных спосабаў перадачы чужой мовы ў публіцыстычных тэкстах к. XIX – п. XX ст.

У публіцыстычных тэкстах разглядаемага перыяду нярэдка адлюстроўваецца **тэматычнае маўленне** – адзін са спосабаў перадачы чужога выказвання. "Тэматычнае маўленне прама суадносіцца з ускосным, што дае падставу лічыць яго адметнай разнавіднасцю апошняга". Аднак, як сцвярджае Р.М. Чумакоў, генетычна і з сучаснага пункту погляду тэматычнае маўленне – самастойны спосаб перадачы чужога выказвання [1, с. 29]. Ускоснае маўленне заўсёды з'яўляецца структурай бінарнай, бо складаецца з дзвюх нераўнапраўных частак, адна з якіх паясняе і дапаўняе другую і сінтаксічна падпарадкавана ёй. Тэматычнае ж маўленне, па канцэпцыі А.А. Патабні, успрымалася як просты сказ з дзеясловам маўлення і аб'ектам пры ім [1, с. 29].

На сучаснам этапе мы дыферэнцыруем гэтыя два паняцці ў залежнасці ад структуры і семантыкі. Ускосная мова і тэматычнае маўленне – гэта своеасаблівы пераказ чужога выказвання. Аднак, у адрозненне ад ускоснай мовы, якая перадае больш-менш дасканала змест чужой мовы, тэматычнае маўленне толькі называе прадмет размовы і не перадае дакладна інфармацыю гаворачага. Гэты тып мовы настолькі скарачае змест выказвання, што ў ім застаецца толькі асноўная тэма. Для публіцыстычных тэкстаў, дзе памер твора мае свае межы, лаканічны спосаб перадачы інфармацыі найбольш прымальны. Магчыма, гэта адна з прычын распаўсюджанасці гэтага тыпу маўлення ў дадзеным стылі мовы.

З улікам граматычных значэнняў кіруемых слоў можна вылучыць наступныя структурныя разнавіднасці і варыянты тэматычнага маўлення:

I. Тэматычнае маўленне – член сказа (чужая мова прадстаўлена ў выглядзе члена сказа, словазлучэння):

1. Аб'ектнае безпрыназоўнікавае: *Правіцельства прыгатавала праект устройства агульнага абучэння, каб усе ў нас былі граматныя – і кабеты, і мужчыны* [2, с. 173]:

а) інфінітыўнае: *Цар Іоан прыказаў хрысціць усіх жыдоў, а тых каторые спрацівяцца, тапіць у Дзьвіне* [Н.Н. – 1910. – № 6. – С. 94];

б) азначальнае (тэматычны цэнтр маўлення – недапасаванае азначэнне): *Газетная аб'ява аб прынцыпова новых умовах аселасці яўрэяў у Расіі, нягледзячы на сталыя дагэтуль пагалоскі, хоць не стала для іх навіною, аднак выклікала сярод іудзеяў цяжкае ўражанне...* [3, с. 135];

в) прыслоўнае (цэнтр тэматычнага маўлення выражаны прыслоўем): *Недаўна вечэрам да аднаго гаспадара нашай вёскі зайшоў нейкі малады хлапец – жэб-*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

рак, і стаў прасіцца нанач, але гаспадар ня згодзіўся і баючыся, што гэта злодзей, пайшоў да суседзей па раду; пакуль ён вярнуўся, хлапца не стало [Н.Н. – 1910. – № 8. – С. 130];

2. Аб'ектнае прыназоўнікавае – з прыназоўнікамі, якія ўжываюцца ў родным: *Суд находзіў, што гэтая стацьця, каторая разыйшлася усюды, клічэ да бунта проці цяперэшняго парадку* [Н.Н. – 1910. – № 5. – С. 74], месным: *Крыху ажыўляецца заседаньне пры запытанні трудавой групы аб кары сьмерці* [Н.Н. – 1910. – № 6. – С. 75] і вінавальным склонах: *З гэтаю мэтай не зашкодзіла б, відаць, нашай санітарнай камісіі інфармаваць пра ўсе выпадкі дыфтэрыту і прыпыніць продаж і дарэнне вопраткі памерлых дзяцей* [3, с. 131].

М.К. Мілых адносіць прыведзеныя вышэй сказы і сказы з аналагічнай будовай (*Ніхто ніводным не згадаў пра 20 лістапада 1864 г. і пра яго значнасць* [3, с. 135]) да ўскоснай мовы, дзе яна выражаецца іменным словазлучэннем. Ён лічыць, што ў канструкцыях з ускоснай мовай шырока выяўляецца дзеяслоўнае кіраванне назоўнікамі, што ўдакладняюць маўленне або думку. Склонавая форма, якая адносіцца да дзеяслова маўлення, з'яўляецца сэнсавым і граматычным цэнтрам ускоснага пераказу паведамлення; паясняльныя словы, якія знаходзяцца пры ёй, у той ці іншай ступені раскрываюць змест выказвання [4, с. 98].

II. Тэматычнае маўленне – сказ (чужая мова прадстаўлена ў выглядзе сказа або групы сказаў): *Дзеля таго кожны, хто разумее карысць навукі для народа, павінен добра падумаць і сказаць сваё слова аб тым, якія мусяць быць новыя начальныя народныя школы, што правіцельства будзе адкрываць* [2, с. 173].

Па характару перадачы чужой мовы вылучаюцца дзве разнавіднасці тэматычнага маўлення (гэту класіфікацыю прапанаваў Р.М. Чумакоў). Ад чужой мовы ў сказе можа застацца або паведамленне тэмы (*Дэп. Кузнецов... падае голас проці гэтаго закона, дзеля таго, што народ і так ўжо бедны усё новыя і новые падаткі на чыноўнікоў* [Н.Н. – 1910. – № 1. – с. 2]), або пытанне (спіс пытанняў), якія закранаюцца ў перадаваемым маўленні (*Бабуля-каваліха, адвітаўшыся, запрасіла да сябе ў госці, а калі патрэбна будзе аб чым пагаварыць, то каб па яе падсылалі мы...* [2, с. 135]).

Для разумення сутнасці тэматычнага маўлення, у параўнанні з прамой або ўскоснай мовамі, неабходна ўлічваць спосабы перадачы маўлення(аўтар перадае толькі прадмет размовы, тэму), структурнае адрозненне, нават пры аднолькавым змесце [1, с. 31].

Адным са спосабаў перадачы чужой мовы ў публіцыстычных тэкстах к. XIX – п. XX ст. з'яўляецца выкарыстанне аўтарамі і **ўскоснай мовы**. Адметная яе рыса – гэта тое, "што змешчанае ў ёй чужое выказванне падаецца ад імя аўтара, а не ад таго, каму належыць. У такіх выпадках захоўваецца толькі агульны змест чужога выказвання, а не яго лексічныя, граматычныя і стылістычныя асаблівасці" [5, с. 295].

Н.С. Валгіна падае наступнае азначэнне: ускосная мова – гэта чужая мова, якая перадаецца аўтарам у форме даданай часткі сказа, захоўваючы яе змест [6, с. 388].

Ускосная мова афармляецца як складаназалежны сказ, дзе даданая частка (ускоснае маўленне) звязваецца з галоўнай (словамі аўтара) пры дапамозе злучнікаў і злучальных слоў. "Як спосаб перадачы чужога выказвання, ускосная мова характарызуецца не столькі тым, што яна, у адрозненне ад простай, перадае яго з пэўнымі зменамі, колькі парушэннем суб'ектна-мадальнага плана структуры" [1, с. 18].

Простая мова перадае чужое маўленне даслоўна, без парушэння ўсіх яго асаблівасцей. Яна ўводзіцца ў кантэкст пры дапамозе слоў аўтара, якія паказваюць, каму яна належыць, а ўскоснае маўленне "змяняе пункт погляду, пры гэтым

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

змены лексічнага складу можа не быць, але змены са структурна-інтанацыйнага боку" прысутнічаюць [1, с. 18]. Тым не менш ускосная мова мае перавагу над простай у эканомным выбары лексічных сродкаў пры перадачы выказвання. Яно атрымліваецца лаканічным па змесце, але, безумоўна, не такім эмацыянальным. Мэта ўскоснай мовы – перадаць толькі інфармацыю, якую выказвае гаворачы, яе змест, а не тое, як ён гэта кажа.

У публіцыстычных тэкстах ужываюцца дзве асобныя структурныя мадэлі ўскоснай мовы: злучнікавая і бяззлучнікавая, напрыклад: *Паказываюць людзі, што свенты Ойцец аж з Рыму прыслаў ужэ да нас сваё благаславенне (но маскаль яго спыняе) – гавораць, што прышле і ксяндзоў, што будуць прымаці на уніяцкую веру* [7, с. 36]. Н.С. Валгіна сцвярджае, што ўжыванне злучнікаў звязана з мэтанакіраванасцю чужой мовы. Калі чужая мова з'яўляецца апавядальным сказам, то пры афармленні яе ў выглядзе ўскоснай выкарыстоўваецца злучнік *што* [6, с. 388]. Адна з разнавіднасцей бяззлучнікавай ускоснай мовы, якая сустракаецца ў публіцыстычных тэкстах разглядаемага перыяду, – канструкцыя з прапушчаным злучнікам, усе члены якой структурна прысутнічаюць у сказе, а злучнік лёгка ўзнаўляецца.

Трэба сказаць, танцоры хлопцы і дзеўчаты пад камандай праўдзіваго артыста ў танцах п. Б-аго падабраліся зухі, як адзін; ажно сцэна грымела ад ліхога топоту і ў вачах зіхацело, як ішлі лявоніху, мяцеліцу, або як 10 пекна прыбраных пар, забіваліся доўгім хвастом [Н.Н. – 1910. – № 8. – С. 125]. На нашу думку, перадача аўтарам ускоснай мовы прыўносіць у публіцыстычны тэкст к. XIX – п. XX ст. элемент размоўнасці, пры гэтым адбываецца больш цесная сувязь паміж ім і рэцыпіентам. Аўтар імкнецца да дасканаласці, эмацыянальнасці пры перадачы інфармацыі.

Неабходна засяродзіць, на нашу думку, увагу і на дзеясловах, якія ўводзяць ускосную мову. Яны "кваліфікуюць чужое маўленне, а заканамернасці спалучэння гэтых дзеясловаў з іншымі словамі ўтвараюць сінтагматычныя сувязі" [4, с. 34-35]. Мэтазгодна размеркаваць дзеясловы па семантычных групах, якія найбольш пашыраны ў публіцыстычных тэкстах к. XIX – п. XX ст. У групы аб'ядноўваюцца дзеясловы на аснове агульнай семантыкі, але некаторыя стылістычныя адценні будуць удакладняцца адразу:

1) стылістычна нейтральныя дзясловы з агульным значэннем гаварэння (*расказаць, апавядаць, сказаць, даводзіць, казаць*): *Бараніў рэдактара вядомы адвакат Т. Врублеўскі, каторы ў мудрай, пекнай мове сваёй* ***даводзіў****, што "Наша ніва" газэта сурьёзная, яна вядзе працу сваю не для бунта, а каб кіраваць цёмны народ сапраўднай культурнай дарогай* [Н.Н. – 1910. – № 5. – С. 74]. Дзеясловы незакончанага трывання выкарыстоўваюцца для перадачы абагульненага выказвання, для перадачы аднатыпных падзей. Яны ўводзяць думкі адной або некалькіх асоб;

2) дзеясловы перадаюць адносіны гаворачага да перадаваемай інфармацыі, яго думкі і жаданні: *Партыя акцябрыстоў* ***выказвае*** *свае* ***думкі****, што ў Расеі патрэбны рэформы, а найперш трэба зрабіць рэформу паліціі* [Н.Н. – 1910. – № 10. – С. 154];

3) дзеясловы, якія перадаюць афіцыйныя паведамленні (*паведаміць, дакладаць*): *..паручнік Мейсенкампф* ***даклаў*** *нядаўна свайму начальніку, што пасля атрымання з тутэйшай губернскай касы... скарбовых грошай, стаў на вуліцы ахвярай нападу невядомага злачынца і быў акрадзены на вышэйзгаданую суму* [3, с. 158];

4) дзеясловы, які маюць агульнае значэнне 'атрыманне якіх-небудзь звестак' (*даведацца, чуць* 'даведацца', *пачуць, адчуць* 'зведаць'): *З вуснаў колькіх*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

ужо гаспадароў ***даводзілася чуць****, што маюць намер на наступны год прадаць інвентар, сабраць толькі засеянае восенню жыта, а таксама сена, пасеяць сёе-тое на свой хатні абыходак...* [3, с. 158];

5) дзеясловы ўказваюць на настойлівасць гаворачага, які абараняе свой пункт погляду: *...установа, якая можа* ***запэўніць*** *іх, што ахвяраванні пойдуць на запланаваныя мэты* [3, с. 163]. *Нейкі п. Баляслаў Стоцкі ўжо ў 1881 г. у пісьме пракурору* ***сцвярджае****, што дакументы, прадстаўленыя Адамковічам, з'яўляюцца фальшывамі...* [3, с. 162].

Чужая мова, якая перадаецца дослоўна, з захаваннем зместу і формы, называецца **простай мовай**. Яна звычайна ўводзіцца ў канву твора словамі аўтара, якія паказваюць прыналежнасць выказвання да асобы і знаходзяцца або перад простай мовай, або пасля яе.

Двесці лет таму назад, а бацькі нашы ляпей ужэ казалі: "Калі маеш Бога ў сэрцу і прыказ Яго, памагай бліжнему" і ішлі бараніць хрысціянства ад татарскай дзічы; да гэтакай памоцы хаця і маем права, но мы не вымагаем, няхай кожан робіць, як яму ляпей здаецца [7, с. 44]. Прыведзены прыклад нагадвае бяззлучнікавы складаны сказ, бо "простая мова і словы аўтара з'яўляюцца састаўнымі часткамі сінтаксічнай канструкцыі" [5, с. 293]. Паміж гэтымі часткамі існуюць аб'ектныя адносіны.

Часам простая мова, якая належыць адной асобе, уключаецца ў простую мову, якая належыць іншым асобам: *Усе смяюцца і кажуць: "Дзядзьку, мог бы ты нам боты прынесці?" – "Не маю, – кажа, – што Бог даў, тое аддаю. Васемнаццаць гадоў, як стуль... А што будзе, пэўне, надта смехатлівае прадстаўленне папросту?" – І круціць галавой старэнькі, не верачы, што пекна выйдзе* [2, с. 212].

У публіцыстычных тэкстах простая мова можа ўжывацца ў выглядзе цытат іншых аўтараў: *"Шмат было такіх народаў, – кажа песняр беларускі Мацей Бурачок, – што страцілі напэрш мову сваю, так, як той чалавек прад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы, хто якую носе, ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы"* [2, с. 174]. У дадзеным прыкладзе аўтар прыведзенымі словамі Ф. Багушэвіча, з аднаго боку, падмацоўвае свае папярэднія думкі аб навучанні ў школах на роднай мове, аб тым, што патрэбна друкаваць кнігі і газеты на беларускай мове, каб народ не цураўся сваёй мовы перад іншымі людзьмі, з другога, выказвае першапачатковую думку паважанай асобы па гэтай праблеме.

Простая мова можа змяшчаць словы з іншай (замежнай) мовы для перадачы асаблівасцей гаворкі дзеючай асобы, для дакладнасці пры апісанні падзей: *Бацька, гэта самы дзядуль, аб каторым раней успаміналі, стукнуўшы пальцам у партрэт сына: "Хюве пойка!" – сказаў, – харошы хлапец, значыцца* [2, с. 135].

Простая мова можа перадаваць і дослоўны змест прымаўкі: *Праўду гаворыць старая прымаўка: "Бог стварыў вёску, а людзі горад"* [3, с. 167]. Гэта падкрэслівае імкненне аўтара перайсці на ўзровень інтэртэкстуальнасці, культурнага дыялогу. Аўтар уздымае пытанні, якія хвалявалі і прыцягвалі ўвагу народа на працягу тысячагоддзяў.

Як бачым, простая мова шырока выкарыстоўваецца аўтарамі ў публіцыстычных тэкстах не толькі як сродак характарыстыкі персанажаў, але і для падмацавання думак, аргументаў, якія прыводзяцца ў тэксце.

Прааналізаваны вышэй матэрыял дае падставу сцвярджаць, што прычыны выкарыстання выказванняў іншых асоб у публіцыстычных тэкстах к. XIX –

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

п. XX ст. вынікаюць з самой прыроды стылю, імкнення, з аднаго боку, да ўсебаковага паказу падзей, шматаспектнасці, дакладнасці інфармацыі, з другога боку, да эмацыянальнага выражэння думкі з максімальнай эфектыўнасцю як для чытача, так і для самога аўтара. Пры аналізе фактычнага матэрыялу выяўлены розныя спосабы перадачы чужой мовы: тэматычнае маўленне, простая мова і ўскосная, а таксама іх структурныя мадэлі.

ЛІТАРАТУРА

1. ***Чумаков, Г.М.*** Синтаксис конструкции с чужой речью / Г.М. Чумаков. – Киев: Изд-кое объединение "Вища школа", головное изд-во, 1975. – 220 с.
2. ***Цётка.*** Выбраныя творы [Тэкст] / Цётка; [уклад., прадм. В. Коўтун; камент. С. Александровіча, В. Коўтун; серыя 1. Мастацкая літаратура]. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2001. – 336 с.
3. ***Багушэвіч, Ф.*** Творы: Вершы, паэмы, апавяданні, артыкулы, лісты [Тэкст] / Ф. Багушэвіч; [уклад., прадм. Я. Янушкевіча; камент. У. Содаля, Я. Янушкевіча]. – Мн.: Маст. літ., 1991. – 309 с.
4. ***Милых, М.К.*** Конструкции с косвенной речью в современном русском языке / М.К. Милых. – Ростов: Изд-во Ростовского ун-та, 1975. – 212 с.
5. ***Бурак, Л.І.*** Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя [Тэкст] : [вучэб. дапаможнік для філал. фак. ун-таў] / Л.І. Бурак. – Мн.: Выд-ва "Універсітэцкае", 1987. – 320 с.
6. ***Валгина, Н.С.*** Синтаксис современного русского языка [Текст] : учебник для вузов / Н.С. Валгина. – М.: Высш. школа, 1973. – 423 с.
7. ***Каліноўскі, К.*** За нашу вольнасць. Творы, дакументы [Тэкст] / К. Каліноўскі; [уклад., прадм., пасляcл. і камент. Г. Кісялёва; серыя 2. Гісторыка-літаратурныя помнікі]. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1999. – 464 с.

Паступіў у рэдакцыю 12.02.2007 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова